песень, звычаяў і пад. Паколькі гэтыя віды побыту і занятку насельніцтва мелі працяглую традыцыю існавання на тэрыторыі, то паводле гэтых звестак можна скласці поўную карціну эканамічнага становішча і культурнага развіцця губерні не толькі на той гістарычны перыяд, але і на некалькі стагоддзяў раней, што сведчыць пра даўнасць і неперарыўнасць культурнай і рамесніцкай традыцыі народа.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Германова, Н. Н.** Кодификация языковых норм: национально-культурные особенности (постановка проблемы) / Н. Н. Германова // Ежегодные междунар. чтения памяти кн. Н. С. Трубецкого – 2000 (17–18 апреля 2000 г.) / Под ред. В. Н. Базылева и В. П. Нерознака. – Москва, 2000. – С. 25–26.

2. Библиографический указатель русской этнографической литературы о внешнем быте народов России. 1700–1910 гг. Жилище. Одежда. Музыка. Искусство. Хозяйственный быт / Сост. Д. К. Зеленин. – Санкт-Петербург: Тип. А. В. Орлова, 1913. – XL, 733 с.

3. **Мыльников, А. С.** Картина славянского мира: взгляд из Восточной Европы: представления об этнической номинации и этничности XVI – начала XVIII в. / А. С. Мыльников. – Санкт-Петербург : Петербургское востоковедение, 1999. – 400 с.

4. **Перлов, А. М.** История науки: введение в методологию гуманитарного знания / А. М. Перлов. – Москва: РГГУ, 2007. – 308 с.

5. **Плотникова, А. А.** Словари и народная культура: Очерки славянской лексикографии / А. А. Плотникова. – Москва: Ин-т славяноведения РАН, 2000. – 208 с.

6. **Пыпин, А. Н.** История русской этнографии. Т. 4. Белоруссия и Сибирь / А. Н. Пыпин. – Минск: БелЭн, 2005. – 256 с.

УДК 903:902.64 (476) «632»

***А. У. Коласаў***

# МЕЗАЛІТ БЕЛАРУСІ Ў ЛЮСТЭРКЕ СТАДЫЯЛЬНАГА ПАДЫХОДУ

**Анатацыя.** Разгледжана характарыстыка стадыяльнага падыходу, які панаваў у археалагічнай навуцы Беларусі ў 1930–40-я гг. і дэманстраваў пераемнасць і непарыўнасць гістарычнага працэса ў развіцці культуры. Для мезаліту (эпіпалеаліту) краіны была прапанавана схема, якая ўлічвала тры культурныя стадыі – свідэрскую (азіль), тардэнуаз і кампіні. У пачатку 1950-х гг. на фоне крытыцы стадыялізму адбыўся пераход да новага падыходу, які патрабаваў улічваць культурную своеасаблівасць мезалітычнай эпохі. Рэцэдывы стадыяльнага схематызму, некаторыя яго канцэптуальныя ўстаноўкі прасочваліся ў даследаваннях 1960–90-х гг.

**Ключавыя словы**: мезаліт, эпіпалеаліт, Беларусь, стадыяльны падыход.

У беларускай археалогіі 20–30-я гг. мінулага стагоддзя сталі этапам мэтанакіраванага пошуку і вывучэння першабытных помнікаў. Экспедыцыі пад кіраўніцтвам К. М. Палікарповіча, А. М. Ляўданскага, А. Д. Кавалені, С. А. Ду-

бінскага, І. А. Сербава [1, 4, 12–15], а таксама актыўны ўдзел аматараў археалогіі і краязнаўцаў А. І. Рынейскага, І. Р. Калодкіна, М. Н. Канвісарава, А. Л. Аніхоўскага і інш. дазволілі зафіксаваць на тэрыторыі БССР каля 800 стаянак каменнага і бронзавага вякоў, 50 з іх адносіліся да эпохі мезаліту. На некаторых мезалітычных паселішчах – Печанеж (1930), Журавель (1934), Крыжы (1936) – былі праведзены раскопкі [1, 4, 14, 15].

Назапашванне матэрыялаў заканамерна вяло да неабходнасці іх упарадкавання і абагульнення. Вынікам такой працы стала стварэнне ў пачатку 1930-х гг. схемы развіцця старажытных культур. Яе аўтарам выступіў беларускі навуковец К. М. Палікарповіч [12, 13]. У гэтай схеме знайшлося месца і эпосе мезаліту. Менавіта сам тэрмін «мезаліт» упершыню быў ужыты ў публікацыях К. М. Палікарповіча і, нават, уключаны ў назвы некаторых яго артыкулаў [12, 13]. Пасля гэтага на працягу 1930–40-х гг. у публікацыях даследчыкаў будзе выкарыстоўвацца іншае, эквівалентнае тэрміну «мезаліт» паняцце – «эпіпалеаліт».

У аснове прапанаванай схемы ляжаў так званы стадыяльны падыход, які дэманстраваў пераемнасць і непарыўнасць гістарычнага працэса ў межах вылучаных стадый развіцця. Для кожнай з іх, на думку тагачасных даследчыкаў, быў уласцівы свой ўзровень сацыяльных і эканамічных адносін. У археалогіі гэты ўзровень быў адлюстраваны ў артэфактах матэрыяльнай культуры. Развіццё апошняй паўставала як агульны і заканамерны працэс замяшчэння стадый.

У дачыненні да эпохі мезаліту (эпіпалеаліту) былі вылучаны тры культурныя стадыі, назвы якіх былі запазычаны з французскай схемы [12, 13]. Не выключалася таксама прысутнасць помнікаў культуры маглемазэ [12, с. 220].

Ранні этап эпіпалеаліту характарызавала свідэрская і/ці азільская стадыя. Да гэтай стадыі К. М. Палікарповіч аднес стаянкі Грэнск, Каромка, Латкі, Стаўбун, Печанеж. Крамянёвы інвентар гэтых помнікаў вызначаўся знаходкамі тронкавых наканечнікаў стрэл, разцоў, скрабкоў «на канцы вузкіх пласцінак» і скрабкоў высокай формы.

Новы этап развіцця эпіпалеалітычнай культуры вызначала стадыя тардэнуаз, для якой была ўласціва мікралітызацыя каменнай індустрыі. Для абгрунтавання тардэнуаза К. М. Палікарповіч спасылаўся на знаходкі «трапецападобных форм наканечнікаў стрэл і невялікіх вострый у выглядзе пласцінак са збітым краем» [13, с. 84]. Мяжа пашырэння тардэнуазскіх помнікаў К. М. Палікарповічам праводзілася па лініі Бранск – Чэрыкаў – Новы Быхаў – р. Друть і далей яна цягнулася на захад у бок Віленшчыны.

Завяршала мезаліт, па схеме К. М. Палікарповіча, стадыя кампіны, якая знаходзілася «на мяжы мезаліту і неаліту (протанеаліт)» [13, с. 83]. На думку К. М. Палікарповіча, стадыя кампіні была выразна прадстаўлена на помніках Пасожжа і вызначала пачатак фарміравання культуры макралітычнага выгляду. У якасці прыкладу даследчык прыводзіў знаходкі прыладаў тыпу «авальны пік,

у адным выпадку траншэ, … грубыя разцы» [13, с. 84]. Да стадыі кампіны была аднесена стаянка Журавель, асобныя знаходкі каля Чачэрска і Новага Быхава [12, с. 221; 13; 15, с. 53, 66–71, п. 19].

У канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. стала відавочнай хісткасць схемы «свідэр (азіль) – тардэнуаз – кампіны». Так, К. М. Палікарповіч у эпіпалеаліце БССР адзначыў толькі дзве стадыі – раннюю (свідэрскую) і познюю (тардэнуазскую), не згадваючы ніводнага слова аб стадыі кампіны [14, с. 59–61]. Аднак у артыкуле «Стоянки Среднего Посожья» [15, с. 48–148] аўтар даў характарыстыку месцазнаходжанням эпіпалеаліту і стадыі кампіны. Паняцце аб тардэнуазскіх знаходках адсутнічала [13, с. 84].

Момант ісціны наступіў у 1950-я гг. і звязаны з працамі М. В. Ваяводскага [3]. Яшчэ ў сярэдзіне 1930-х гг., у межах стадыяльнага падыходу, для эпіпалеаліту Рускай раўніны ён абгрунтаваў адзіную свідэрскую стадыю [2, с. 230–245]. У наступныя гады М. В. Ваяводскі выявіў, што на розных тэрыторыях Усходняй Еўропы мезаліт праяўляе культурную спецыфіку і адзінай свідэрскай стадыі не існуе. «Яўнае адзінства, – пісаў М. В. Ваяводскі, – тлумачыцца, па-першае, шырокім распаўсюджваннем лазалістых наканечнікаў стрэл і, па-другое, наяўнасцю перажытачных мадленскіх формаў прылад. Абедзве гэтыя з'явы характэрны наогул для ранняй стадыі мезаліту амаль усёй Еўропы» [3, с. 97]. Такім чынам, калі помнікі дзвух традыцый маглі існаваць адначасова, то казаць аб іх паслядоўнасці ў рамках адзінай стадыі не прыходзіцца [3, с. 98–101].

У выніку М. В. Ваяводскі прапанаваў адмовіцца ад стадыяльнага схематызму, паклаўшы пачатак фарміраванню новай парадыгме, якая павінна была ўлічваць культурную своеасаблівасць мезалітычнай эпохі. Матэрыялы стаянак на паўночным захадзе Рускай раўніны ім былі аднесены да ўсходняй групы свідэрскай культурнай вобласці [3, с. 97–98]. На тэрыторыі Беларусі да гэтай групы помнікаў была аднесена стаянка Грэнск на Сожы [3, с. 98].

Новы падыход даў імпульс навуковым даследаванням, якія фактычна прывялі да рэанімацыі паняцця «мезаліт» у 1950–60-я гг. і вылучэння мезалітазнаўства як самастойнай вобласці навуковых даследаванняў у Беларусі. Праўда, у тыя ж 50–60-я гг. на этапе распрацоўкі канцэпцыі лакальнага мезаліту адзначаліся рэцэдывы схематызму. Яго прыкладам з'яўляецца канцэпцыя «мікра-макралітоіднага мезаліту», агучаная ў працах У. Ф. Ісаенкі [6, с. 56–59; 11, с. 55–66] і У. П. Левянка [7, с. 88–98].

Для мезаліту Беларусі У. Ф. Ісаенка прапанаваў вылучыць тры культурна-гістарычныя вобласці з мікра-, макра- і макраліта-мікралітычным аблiччам крамянёвага інвентару [6, с. 56–59]. Беларускае Падняпроўе У. Ф. Ісаенка аднёс да вобласці пашырэння макралітаў (прылады на адшчэпах, рубячыя формы). Усходняе Палессе было ўключана ў зону з мікралітычным інвентаром. Тут пераважалі прылады невялікіх форм і памераў, а на стаянках шырока былі прадстаўлены геаметрычныя мікраліты – трапецыі, трохкутнікі, сегменты і г. д.

Нарэшце, тэрыторыя Заходняга Палесся і Панямонне, на думку У. Ф. Ісаенкі, адносілася да культурнай вобласці з інвентаром мікра-макралітычнага аблічча.

У «Очерках по археологии Белоруссии» [11], дзе аўтарам раздзела па мезаліце быў У. Ісаенка, для Верхняга Падняпроўя, як зоны макралітаў, былі вылучаны дзве храналагічна разнастайныя групы помнікаў. Раннюю групу (ранні мезаліт) прадстаўлялі стаянкі каля вв. Вярхі (урочышча Мястэчка), Ворнаўка, Дубна (урочышча Бышарына Поле), Касцюкоўка, Ліцвінавічы, Рудня Споніцкая (Латкі), Талкачоўка (цяпер в. Аляксандраўка 2-я) і г. Слаўгарад (урочышча Узлужжа). Позняя група аб'ядноўвала стаянкі Дабранка, Журавель і Печанеж [11, с. 57–59].

Адрозненне паміж ранняй і позняй групамі помнікаў, як лічыў У. Ісаенка, праяўлялася ў тыпалагічным складзе крамнёвага інвентару. Так, для стаянак ранняга мезаліту былі ўласцівы «чаранковыя наканечнікі стрэл, невялікія пласціністыя наканечнікі з бакавой выемкай у чаранка, бакавыя, а радзей сярэдзінныя і вуглавыя разцы, скрабкі на канцы пласцін і адшчэпаў, якія мелі нярэдка высокі профіль, падвоеныя канцавыя скрабкі, акруглыя высокія скрабкі, нажападобныя пласціны з рэтушшу, з бакавой выемкай, пласціны-ўкладышы, пласціны са скошаным канцом і прытупленым краем, скрэблы, скрабкі, грубыя нуклепадобныя прылады» [11, с. 57].

Як бачна, для стаянак ранняга этапу відавочна пласціністасць крамянёвага інвентару, аб чым пісаў і сам У. Ісаенка: «каля паловы прыладаў было зроблена з крамянёвых пласцін, у асноўным невялікіх па памеры» [11, с. 57].

Матэрыялы другой (позняй) групы помнікаў давалі прыклад развіцця тыповай адшчэпавай індустрыі. Позні мезаліт, на думку У. Ісаенкі, стаў часам шырокага пашырэння «канцавых скрабкоў на плоскіх пласцінках і адшчэпках, авальных скрабкоў, скобляў, сярод якіх частка выпрацоўвалася з масіўных адшчэпаў, вуглавых разцоў, нярэдка масіўных і груба апрацаваных, свердзелаў, праколак і буйных нажападобных пласцін» [11, с. 57, 59]. Але самы галоўны паказчык макралітоіднасці позняга мезаліту – з'яўленне «грубаабабітых сякер і сякерападобных прыладаў», а таксама «груба апрацаваныя лістападобныя вастрыі» [11, с. 59].

Падобных поглядаў прытрымліваўся У. П. Левянок [7], які вылучыў дзве лініі ў развіцці мезаліту: макралітычную, генетычна звязаную з мясцовым палеалітам, і мікралітычную, якая развівалася на заключных этапах мезаліту [7]. Стаянкі Беларускага Пасожжа (Грэнск, Латкі, Печанеж, Стаўбун, Журавель) былі аднесены У. П. Левянком да развітай позняй групы «макралітоіднага мезаліту» [7, с. 92–93].

Палажэнні, прапанаваныя У. Ф. Ісаенкам і У. П. Левянком на карысць «мікра-макралітоіднага мезаліту», былі падвергнуты крытыцы з боку Л. Я. Крыжэўскай [9], А. А. Фармозава [16, с. 8–9], В. Ф. Капыціна [8, с. 4], У. П. Ксянзова [10]. Напрыклад, як адзначалі А. А. Фармозаў і Л. Я. Крыжэўская, рубячыя прылады вядомы ва ўсіх культурах эпохі мезаліту, таму яны

не могуць з'яўляцца лакальным паказчыкам макралітоіднасці крамянёвага інвентару помнікаў, як гэта прапаноўвалі У.Ф. Ісаенка і У.П. Левянок.

Па сутнасці, канцэпцыя «мікра-макралітоіднага мезаліту» мела падабенства са стадыяльным схематызмам 1930–40-х гг. Розніца заключалася толькі ў вызначэнні тэрытарыяльнай прыналежнасці крамянёвай індустрыі мезалітычных стаянак. Уяўленне аб зонах пашырэння мікра- і макралітаў не знайшло сваё пацверджанне ў 1970–80-я гг., калі з'явіліся матэрыялы, атрыманыя ў выніку раскопак помнікаў мезалітычнага часу.

Метадалогія стадыяльнага і лакальнага схематызму абапіралася ў асноўным на пад'ёмны матэрыял, які для абгрунтавання культурнай спецыфікі эпохі мезаліту аказаўся малаінфарматыўным. У гэтым была праблема разгледжаных у артыкуле канцэптуальных падыходаў. Між іншым стадыяльны падыход 1930–40-х гг. з'яўляўся спробай перыядызацыі помнікаў. Уласна для мезаліту (эпіпалеаліту) Беларусі такая спроба рабілася ўпершыню.

Характэрная для стадыялізму ідэя аб пераемнасці культуры ў 1960–90-я гг. перамясцілася ў плоскасць канцэпцыі аб лакальных культурах. У межах культурна-гістарычнага падыходу мезаліт стаў разглядацца праз прызму паступальнага развіцця традыцый асобных культурных з'яў, а генезіс асноўнай часткі культур разглядаўся з пазіцыі аўтахтанізму. Прыкладам апошняга з'яўляецца канцэпцыя паходжання грэнскай культуры [8]. Ідэя аб пераемнасці традыцый у мезаліце Беларусі была ўвасоблена ў поглядах на сожскую [8], днепра-дзяснінскую [10] і нёманскую культуры [5].

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Алексеев, Л. В.** Археология и краеведение Беларуси: XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларуская навука, 1996. – 206 с.

2. **Воеводский, М. В.** К вопросу о ранней (свидерской) стадии эпипалеолита на территории Восточной Европы / М. В. Воеводский // Труды II Международной конференции АИЧПЕ: тр. II Междунар конф. – Москва; Ленинград; Новосибирск, 1934. – Вып. V. – С. 230–245.

3. **Воеводский, М. В.** Мезолитические культуры Восточной Европы / М. В. Воеводский // Краткие сообщения Ин-та истории материальной культуры. – Москва, 1950. – Вып. XXXI. – С. 96–120.

4. **Вяргей, В. С.** Археалагічная навука ў Беларускай ССР: 1919–1941 гг. / В. С. Вяргей. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.

5. **Гурина, Н. Н.** Мезолит Литвы и Белоруссии / Н. Н. Гурина // Мезолит СССР; под ред. Л. В. Кольцова. – Москва, 1989. – С. 55–60.

6. **Исаенко, В. Ф.** Археологическая карта Белоруссии: памятники каменного века / В. Ф. Исаенко. – Минск : Полымя, 1968. – Вып. I. – 125 с.

7. **Левенок, В. П.** Мезолит среднерусского Днепровско-Донского междуречья и его роль в сложении неолитической культуры / В. П. Левенок // Материалы и исследования по археологии СССР. – Москва ; Ленинград, 1966. – № 126. – С. 89–98.

8. **Копытин, В. Ф.** Памятники финального палеолита и мезолита Верхнего Поднепровья / В. Ф. Копытин. – Могилев : МОУТ, 1992. – 86 с.

9. **Крижевская, Л. Я.** Еще раз о мезолите среднерусского Днепро-Донецкого междуречья / Л. Я. Крижевская // Краткие сообщения Ин-та археологии. – Москва, 1977. – Вып. 149. – С. 75–77.

10. **Ксензов, В. П.** Мезолит Северной и Центральной Беларуси / В. П. Ксензов. – Минск : ИИ НАНБ, 2006 – 158 с. (МАБ ; вып. 13).

11. Очерки по археологии Белоруссии / Редкол. : В. Ф. Исаенко [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1970. – 272 с.

12. **Палікарповіч, К. М.** Палеоліт і мэзоліт БССР і некаторых суседніх краін Верхняга Падняпроўя / К. М. Палікарповіч // Працы сэкцыі археолёгіі. – Менск, 1932. – Т. 3. – С. 218–221.

13. **Поликарпович, К. М.** Палеолит и мезолит БССР и некоторых соседних территорий Верхнего Поднепровья / К. М. Поликарпович // Труды II Международной конференции АИЧПЕ: тр. II Междунар конф. – Москва ; Ленинград ; Новосибирск, 1934. – Вып. V. – С. 75–87.

14. **Палікарповіч, К. М.** Вынікі археалагічных даследаванняў на Беларусі пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі / К. М. Палікарповіч // Весці АН БССР. Адзяленне грамададскіх навук. Сек. гістарычная. – 1947. – Вып. 1. – С. 53–74.

15. **Поликарпович, К. М.** Стоянки Среднего Посожья / К. М. Поликарпович // Материалы по археологии БССР. – Минск, 1957. – Т. 1. – С 45–148.

16. **Формозов, А. А.** О критике источников в археологии / А. А. Формозов // Советская археология. – 1977. – № 1. – С. 5–14.

УДК (811.161.1+811.161.3)’28

***И. Н. Лапицкая, Л. И. Шаповалова***

# «ОПЫТ ОПИСАНИЯ МОГИЛЕВСКОЙ ГУБЕРНИИ …» КАК ИСТОЧНИК ЭТНОГРАФИЧЕСКОГО КОММЕНТИРОВАНИЯ В РЕГИОНАЛЬНОМ СЛОВАРЕ (НА МАТЕРИАЛЕ «СЛОВАРЯ МОГИЛЕВСКО-СМОЛЕНСКИХ ПОГРАНИЧНЫХ ГОВОРОВ»)

**Аннотация.** Показана научная значимость труда «Опыт описания Могилевской губернии …» для современных гуманитарных исследований и возможность применения его этнокультурного потенциала в региональной лексикографии.
**Ключевые слова**: этнокультурный потенциал, этнографический источник, этнографический комментарий, региональный словарь.

Сто сорок лет назад увидела свет первая книга уникального труда «Опыт описания Могилевской губернии в исторических, физико-географических, этнографических, промышленных, сельскохозяйственных, лесных, учебных, медицинских и статистических отношениях», который был «составлен по программе и под редакцией председателя Могилевского губернского статистического комитета А. С. Дембовецкого» [5]. Этот труд, как свидетельствует само его название, является подлинно энциклопедическим по широте и всесторонности охвата жизни губернии и подлинно научным по аргументированности опи-